# ТАЙНЫ СТАРАДАЎНІХ НАДПІСАЎ

**Кожны эпіграфічны помнік з'яўляецца цікавай і важнай гістарычнай крыніцай, нягледзячы на тое, змяшчае ён вялікі надпіс ці ўсяго некалькі літар. Само існаванне надпісу на прадмеце сведчыць аб пісьменнасці яго ўладальніка ці знаёмстве з пісьменнасцю. А вось мэты нанясення надпісу маглі быць самымі рознымі.**

Вельмі часта на прадметах побыту сустракаюцца надпісы-азначэнні ўласнасці. Да такіх прадметаў можна, напрыклад, аднесці навагрудскую амфару з надпісам ОЛЬКЪСН («Олекси» – «Аляксей»). Часам надпісы, якія абазначаюць прыналежнасць, мяжуюць па сваім сэнсе з магічнымі закляццямі. Сярод іх – рунічныя надпісы на костках з гарадзішча Маскавічы, дзе рунамі абазначаліся адмоўныя з'явы: «нястача», «язвы», «лёд» і іншыя з мэтай абароны або нанясення шкоды іншым людзям. З кірылічных надпісаў-закляццяў найбольш вядомы надпіс XII ст. на крыжы Ефрасінні Полацкай **(на фота)**, а менавіта вось гэтыя словы: «А калі хто непаслухмяна вынясе яго з манастыра, тады не бядзе яму памочнік Святы крыж ні ў гэтым жыцці, ні ў будучым і да будзе пракляты святою жыватворчаю Тройцай і 308 святымі айцамі і сям'ю саборамі святых айцоў і будзе яму доля Іуды, які здрадзіў Хрысту. Хто ж насмеліцца зрабіць гэта: уладар або князь, або епіскап, або ігумення, або іншы які-небудзь чалавек, хай будзе яму клятва гэтая».

Яшчэ адзін надпіс XI ст., які нанесены на не такі каштоўны, у параўнанні з крыжам, прадмет – касцяную рукаятку нажа, знойдзеную пра раскопках Драгічына. У перакладзе ён гучыць так: «Ежкаў нож, а калі хто ўкрадзе – пракляты будзе». Падобныя абарончыя праклёны сведчаць пра тое, якая моц надавалася слову. На жаль, гэта не перашкаджала несумленным людзям рабіць сваю нядобрую справу.





Роднасным да вышэйзгаданых з'яўляецца надпіс, нанесены на жалезную сякеру: ён адрасаваны злодзеям, змяшчае імя ўладальніка і ўскоснае папярэджанне жадаючым скрасці гэтую рэч. Сякера, якая ў дадзены час знаходзіцца у экспазіцыі Музея Беларускага Палесся ў Пінску пад нумарам 9750/24 А-100 **(на фота)**, была знойдзена Б.Міралюбавым падчас раскопак 1976 года ў Пінску 1960-1978 гг. Сякера зроблена з жалеза. Яна мае даўжыню 21 см, шырыню абушка – 3,5 см, лязо роўнае 6,3 см у самай шырокай частцы і 2,6 см – у самай вузкай частцы. З аднаго боку на шырокую частку лязa нанесены круглыя маленькія ямачкі, запоўненыя белым металам. Яны ўтвараюць з аднаго боку кайму, якая аддзяляе надпіс зверху і з бакоў ад астатняй часткі паверхні сякеры. Літары таксама ўтвораны з ямачак, у большасці сваёй запоўненых белым металам. Надпіс можна падзяліць на пяць радкоў. Сукупнасць палеаграфічных прыкмет сведчыць на карысць датавання надпісу XV ст. Што датычыцца зместу надпісу, то ён чытаецца так: Я ЗРИ ВОРЪ КУЗМЫ ТОПОР («Глядзі злодзей – сякера Кузьмы»). Як бачна, надпіс ускосна змяшчае і пагрозу: спроба скрасці ў Кузьмы што-небудзь магла скончыцца дрэнна. Акрамя гэтага, валоданне рэччу, якая насіла на сябе чужое імя, таксама не прынесла б злодзею нічога добрага. Звяртае на сябе ўвагу і слова «топор». Па сведчанні гісторыка Ю.Бохана, у Вялікім княстве Літоўскім у XVI ст. назіралася «ўжыванне тэрміна «сякера» пераважна ў дачыненні да баявых узораў, а «тапор» – у дачыненні да прылад працы». Гэтая сякера магла належаць кавалю, які зрабіў яе для сябе і нанёс для абазначэння ўласнасці дадзены надпіс. З іншага боку, сякера і надпіс на ім маглі быць зроблены на заказ. Але ў любым з выпадкаў бясспрэчным застаецца адно – пісьменнасць майстра. Прычым звяртае на сябе ўвагу не толькі дасканаласць выканання, але і моўная прыгажосць выразу, які напісаны ў рыфму і з'яўляецца вельмі кароткім, дакладным і ёмістым. Пры чытанні атрымліваецца ўражанне, што з глыбіні вякоў да нас дайшоў голас жывога чалавека: працавітага майстра і жартаўніка.

Ці існуюць сярод эпіграфічных помнікаў падобныя на пінскую сякеру? Сярод усходнеславянскіх эпіграфічных помнікаў можна назваць бронзавую з жалезным лязом баявую сякеру «русского происхождения» XII-XIII стст. с праквітнеўшымі крыжамі і не вельмі пісьменна выразанай манаграмай Ісуса Хрыста: IC XC NA, баявую сякеру з грэчаскім надпісам ZωH – «жыццё», сякерку Андрэя Багалюбскага з трыма літарамі А, якая мае не столькі практычнае, колькі цырыманіяльнае прызначэнне.

***Іна КАЛЕЧЫЦ,***
***дацэнт кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя М.Танка, кандыдат гістарычных навук***

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ